рения и апробирования в своей сценографии технологий 3D и 4D. Однако, чтобы использовать данные ноу-хау, нужна солидная материальная база и определенная обеспеченность сценического пространства необходимым оборудованием. Но если рассматривать внедрение данных компьютерных технологий как перспективный феномен, он имеет право на существование в эстетике музыкального театра Беларуси.


*1.* Бумага Медиа [Электронный ресурс] / «Технологии – это завлекуха» : команда мюзикла «Пола Негри» – об экспериментах с 3D в театре. – Режим доступа: http://paperpaper.ru/pola-negri/. – Дата доступа : 02.03.2019.

*2.* LIGHTCONVERSE [Электронный ресурс] / Портфолио. – Режим доступа: http://lightconverse.ua/wp/cat/portfolio/theatre. – Дата доступа: 03.03.2019.

*3.* «Дизайн Досье» [Электронный ресурс] / 3D MAPPING. – Режим доступа: http://3dday.ru/services/3d-mapping/. – Дата доступа : 03.13.2019.


## ВЫЯЎЛЕНЧЫ ЛЕТАПІС ГЕРАІЧНАЙ НАРОДНАЙ БАРАЦЬБЫ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ


***Р. Ф. Шаура****, доктар мастацтвазнаўства, прафесар,*
*загадчык кафедры народна-дэкаратыўна прыкладнога мастацтва*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*


З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны ўсе віды мастацтва пераўтвараліся ў адзін з самых дзейсных сродкаў ідэалагічнай зброі. Плакаты, лозунгі, баявыя ліcткі жыва адгукаліся на падзеі часу, уздымалі дух народа ў часы цяжкіх выпрабаванняў, узмацнялі баявой парыў і веру ў перамогу над агрэсарам. Мастацтва было падпарадкавана адзінай мэце – вызваленню ад фашысцкіх захопнікаў. Свой значны ўклад у гэту вялікую справу ўнесла і творчасць прафесійных і самадзейных мастакоў-партызан.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кожны партызанскі атрад меў свой рукапісны часопіс, у якім адлюстроўваліся баявыя дзеянні народных мсціўцаў. Гэта былі своеасаблівыя дзённікі, у якіх карэспандэнты пісалі нарысы, паэмы, вершы, прыпеўкі, мастакі фіксавалі ваенныя падзеі ў малюнках. Партызанскія часопісы мелі своеасаблівыя назвы, такія, як «Кутузавец», «Варашылавец», «Чырвоны сцяг», «Народны мсцівец», «Сокал», «Смерць фашызму», «Жукавец», «За Радзіму», «Ураган», «Мы пераможам» і інш. Часта назвы часопісаў насілі характар палымяных заклікаў: «Наперад», «На штурм ворага», «У бой за Радзіму».

На тэрыторыі Беларусі ў партызанскіх атрадах разам з усімі змагаліся і прафесійныя мастакі: Г. Бржазоўскі, Л. Бойка, В. Грамыка, Н. Гуціеў, С. Лі, М. Абрыньба, В. Сухаверхаў, С. Раманаў і інш. На сваіх плячах яны неслі вялікі цяжар пастаянных баявых дзеянняў і толькі ў рэдкія вольныя хвіліны бралі ў рукі аловак або пэндаль, і занатоўвалі карціны суровага ваеннага часу. Аднак большасць малюнкаў на старонках партызанскіх часопісаў выканана самадзейнымі мастакамі. Захаваліся імёны параўнальна невялікай групы аўтараў: А. Агафоненка, А. Абрамаў, Г. Алемскі, Г. Барзоў, А. Васільеў, С. Гуткоўскі, А. Гагарын, Л. Дзятлаў, Ф. Заленка, Ф. Красноў, В. Казлоў, М. Ліпень, Г. Лень, В. Лысаў і інш.

Партызанскія часопісы рабіліся саматужным спосабам і з рознай паперы, якую ўдавалася ў тых умовах здабыць. У ход ішла абгортачная папера, шпалеры, старонкі вучнёўскіх сшыткаў, канцылярскія кнігі. Мастакі-афарміцелі выконвалі свае малюнкі простымі алоўкамі з падмалёўкай акварэллю, гуашшу і каляровымі алоўкамі. «Часопісы ствараліся як заклік на барацьбу супраць фашызму і адпавядалі глыбокай патрэбнасці савецкіх людзей паведаць адзін аднаму навіны з фронту, расказаць аб лепшых сваіх таварышах, аб тым, што робіцца ў партызанскім краі, аб дапамозе Масквы, аб непарушным адзінстве народа, аб набліжэнні перамогі...».

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Усе малюнкі партызан-мастакоў ствараліся ў суровых умовах ваеннага часу. Іх аператыўнасць, жыццёвасць і мастацкая выразнасць абумоўліваліся перш за ўсё тым, што аўтарамі іх былі самі байцы, якія пастаянна прымалі ўдзел у аперацыях па разгроме гітлераўскіх гарнізонаў, падрыву чыгуначных саставаў з баявой тэхнікай і жывой сілай праціўніка. У сваіх малюнках яны вельмі трапна раскрывалі злачынныя дзеянні гітлераўскіх катаў на беларускай зямлі, усялялі ў народных мсціўцаў нянавісць да ворага і прагу помсты.

На старонках часопісаў можна ўбачыць партрэты дзясяткаў бясстрашных мсціўцаў, пейзажы, напоўненыя лірыкай, дынамікай шчаслівага мірнага жыцця і трагічнымі карцінамі зруйнаванняў і пажарышчаў злавеснай вайны, кампазіцыі баявых дзеянняў партызан, сатырычныя малюнкі, якім мастакі ў кожным часопісе адводзілі асобнае месца.

Адной вельмі важнай асаблівасцю сатырычнай графікі партызан з'яўляецца цесная ўзаемасувязь тэксту і малюнка. Ніводны сатырычны малюнак не абыходзіўся без суправаджэння тэксту, напісанага ў прозе ці ў вершаванай форме. Як ніколі раскрыўся талент паэтаў, пісьменнікаў, мастакоў, творчасць якіх была заклікана служыць вызваленню народа, прыгнечанага фашысцкімі захопнікамі. Разнастайнасць выяўленчых прыёмаў, якія выкарыстоўвалі партызаны-мастакі, – гіпербала, алегорыя, метафара, гратэск – давалі магчымасць сканцэнтраваць эмацыянальны зарад у тым ці іншым сатырычным малюнку, раскрыць самую сутнасць пэўнага вобраза, з'явы ці падзеі. Асаблівасць такіх малюнкаў заключаецца ў тым, што мастакі маглі жыццёвыя падзеі ваеннага часу праламляць праз прызму іроніі, спалучаць рэальнасць з умоўнасцю сатыры. Гэта ўмоўнасць давала мастакам неабмежаваныя магчымасці свайго творчага ўвасаблення, пашырала граніцы форм выяўленчасці і, зразумела, прыдавала ўсё большую дасціпнасць і цікавасць малюнкам. Шмат напісана вершаў да сатырычных замалёвак на старонках партызанскіх рукапісных часопісаў. Тут і вершы, і асобныя радкі з іх. Такая ўзаемасувязь малюнка і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэксту дазваляла глыбей выявіць вастрыню ідэйнага зместу і эмацыянальна ўздзейнічала на гледача.

Карыкатуры мастакоў-партызан трапна падкрэслівалі тыя рысы, якія найбольш яскрава адлюстроўвалі слабасці ворагаў, часта прыхаваных за напышлівай ганарлівай знешнасцю. Мастакі ў сваіх малюнках выкарыстоўвалі ўсе магчымасці выяўленчых прыёмаў, каб выразна паказаць сапраўднае аблічча ворага.

Партызанская сатыра валодала прастатой і выразнасцю. Змест карыкатур заўсёды праследаваў канкрэтныя жыццёвыя мэты, дзе расказвалася аб пэўных падзеях, аб канкрэтных людзях і іх учынках. Малюнкі рабіліся аператыўна, хутка адгукаліся на тыя ці іншыя падзеі і выстаўляліся на суд гледачоў. У іх партызаны-мастакі вялі расказ аб справах, якія адбываліся ў свеце, аб становішчы на франтах і аб сваіх партызанскіх падзеях.

У шматлікіх выпадках партызанскія карыкатурысты «ажыўлялі» неадухоўленыя прадметы з той мэтай, каб з дапамогай такога прыёму, дабіцца найбольшай «аддачы» сатырычных малюнкаў, узмацніць вастрыню ўздзеяння іх на гледача. У малюнках часта маглі «размаўляць» звяры, дрэвы, нябесныя целы, маглі рухацца вінтоўкі, абутак, адзенне і г. д.

Мастакі імкнуліся нічога не ўпусціць з поля бачання. Штодзённа выпускаліся баявыя лісткі, часта вывешваліся насценныя газеты, дзе таксама ў раздзелах «сатыра і гумар» змяшчалася багатая інфармацыя аб усіх справах суровага партызанскага жыцця. Гумарам былі прасякнута не толькі негатыўныя з'явы. Мастакі імкнуліся праз прызму сатыры паказаць поспехі, удачы ў баявых справах, падняць настрой і дух людзей у цяжкіх умовах барацьбы. Хаця і не ўсе сатырычныя малюнкі аднолькавыя па майстэрстве, мэта дасягалася адна і тая ж. Яны выклікалі ў гледача смех і былі даступны для ўспрыняцця ўсім таварышам па зброі.

Вядома, работы самадзейных партызанскіх мастакоў адрозніваюцца ад работ прафесіяналаў, але ў ацэнцы самадзейнай творчасці нельга падыходзіць з тымі ж крытэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыямі, як да прафесійнага мастацтва, паколькі першае мае адметную асаблівасць. Прыродны талент, здольнасць, шчырасць выказвання думкі і непасрэднасць – аснова мастацкай творчасці непрафесіяналаў.

Як правіла, большасць малюнкаў партызан мае істотныя недахопы у сэнсе тэхнічнага выканання, але гэтыя моманты ніяк не зніжалі ні іх агітацыйнай ролі, ні мастацкай каштоўнасці. Мастацтва народных мсціўцаў прайшло вялікую школу барацьбы, яно знаходзілася на самых перадавых яе рубяжах, у адказных і небяспечных умовах барацьбы. Партызанскія мастакі толькі ў рэдкія хвіліны адпачынку маглі раскрыць свой талент у афармленні газет, часопісаў, плакатаў і баявых лісткоў. І ім не прыходзілася прыдумваць сюжэты карцін вайны ў сваіх творчых работах, паколькі пастаянна знаходзіліся ў самым цэнтры ўсенароднай барацьбы за вызваленне Радзімы.

Кожны часопіс, а іх не адзін дзясятак, адводзіў шмат месца для сатырычных малюнкаў. І сярод партызанскіх мастакоў не было яўнага падзелу на «жанрыстаў», «пейзажыстаў» ці «карыкатурыстаў». Яны былі ўніверсаламі, дэманстравалі творчы талент ва ўсіх кірунках выяўленчага мастацтва. Іх творчасць з'яўляецца дакументальнымі старонкамі летапісу гераічных ваенных гадоў.

Трэба адзначыць, што сабраны ў музеях Беларусі дакументальны выяўленчы матэрыял перыяду Вялікай Айчыннай вайны – толькі невялікая частка таго, што было створана мастакамі ў той суровы час. Цяжкасці лясной дыслакацыі, пастаянныя трывогі, штодзённыя баявыя паходы, пераходы з аднаго месца на другое, блакады, прарывы праз варожыя вогненныя кольцы і гібель часам цэлых атрадаў вялі да беззваротных чалавечых страт і страт дакументальных помнікаў летапісу гераічнай барацьбы шматнацыянальнага савецкага народа супраць фашысцкіх захопнікаў. Не ўсім партызанскім мастакам пашчасціла дажыць да светлых дзён перамогі, але іх творчасць застаецца вечным помнікам мужнасці і гераізму нашага народа ў суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




М. Гурло.
Уварванне
ў Европу



Л. Дзятлаў.
Няўдалы стратэг.
1944 г.




А. Астаф’еў.
Малюнак на
міжнародныя тэмы.
1943 г.

Такім чынам, выяўленчая творчасць перыяду Вялікай Айчыннай вайны ўяўляе сабой спецыфічную з’яву ў гісторыі непрафесійнага выяўленчага мастацтва. Яго ўзнікненне і развіццё былі прадыктаваны ўмовамі барацьбы савецкага народа супраць гітлераўскай Германіі. На тэрыторыі Беларусі, часова акупаванай фашысцкімі захопнікамі, дзейнічалі шматлікія партызанскія злучэнні і брыгады, асобныя палкі і атрады, у якіх распаўсюджанай формай ідэалагічнай і выхаваўчай працы сярод асабістага баявога саставу з’яўлялася выяўленчая творчасць. Мастацтва мастакоў-партызан ўяўляе сабой сінтэз розных фальклорных жанраў і выяўленчай мовы. Змястоўная накіраванасць ўсяго рукапіснага друку забяспечвалася выключна гарманічнай узаемасувяззю слова і малюнка. Выяўленчае мастацтва мела велізарнае выхаваўчае значэнне і з’яўлялася фактарам актыўнага ўплыву на пераможны зыход барацьбы савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

1. *Орлова, М.* Искусство Советской Белоруссии / М. Орлова. – М. : Изд-во Акад. художеств СССР, 1960. – С. 118.

2. *Суздалев, П.* Советское искусство в период Великой Отечественной войны и первые послевоенные годы / П. Суздалев. – М. : Художник, 1963. – 218 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*3.* Памяць: Лепельскі раён: Гісторыка-дакументальная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі / укл. В. Я. Ланікіна, А. У. Стэльмах ; рэдкал.: В. Я. Ланікіна і інш. – Мінск : Беларусь, 1999. – С. 281–284.
*4. Чавускі, М.* Фарбамі гневу / М. Чавускі. – Мінск : Выдавецтва ЦК КПБ, 1975. – 63 с.

## АРХИТЕКТУРНО-ХУДОЖЕСТВЕННЫЙ ОБРАЗ ЗДАНИЯ БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО МУЗЕЯ ИСТОРИИ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

***А. Г. Шимелевич****, кандидат искусствоведения, доцент,*
*доцент кафедры истории и теории искусств*
*Белорусской государственной академии искусств*

В архитектурных исследованиях, посвященных проблемам социальной роли архитектуры, ее эстетической значимости и символического языка, центральное место занимает категория художественного образа. Отмечая сложность структуры художественного образа в архитектурном сооружении, исследователи выявляют в ней роль архитектоники, пластическое начало и знаково-смысловой компонент образной структуры. «Общественное значение и утилитарные функции постройки, предназначенное для этих функций пространство и вся образующая его материальная конструктивно-строительная сторона сооружения, хотя и не исчерпывают идейно-художественного содержания образа, являются основным материалом для его создания» [6, с. 39].

Описание и исследование специфики архитектурно-художественного образа того или иного произведения предшествует анализу функций архитектуры в широком смысле, т. е. анализу ее роли, или, точнее, многочисленных ролей, которые она играет в жизни общества и человека. «В системе культуры архитектура вместе с дизайном занимает место на стыке материальной и духовной культуры, или на стыке материальной, духовной и художественной культуры <...> Архитектура входит в каждую из этих

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ